# Культурна і ветліва

Ажыўлена бывае вечарамі ў Баханской сельскай бібліятэцы. Пасля працоўнага дня сюды прыходзяць члены арцелі, каб прачытаць свежыя газеты, часопісы, цікавыя кнігі, пагуляць у настольныя гульні—шашкі, шахматы, даміно. Загадчыца бібліятэкі Вольга Дзянісаўна Радзькова заўсёды культурна і ветліва адносіцца да наведвальнікаў. Яна дапамагае чытачам выбіраць кнігі, коратка расказвае іх змест, знаёміць прысутных з матэрыяламі XXII з'езда партыі.

З кожным годам папаўняецца кніжны фонд бібліятэкі. Зараз тут налічваецца звыш 6 тысяч тамоў мастацкай, сельскагаспадарчай, палітычнай і тэхнічнай літаратуры. У бібліятэцы ... шэнні XXII з'езда КПСС», «Гэта будзе ў сямігодцы» і інш. На сценах вывешаны лозунгі і плакаты, якія заклікаюць працаўнікоў вёскі на датэрміновае выкананне планаў сямігодкі.

Асаблівую ўвагу Вольга Дзянісаўна звяртае на тое, каб кожны жыхар цікавіўся літаратурай. Састарэлым калгаснікам яна дастаўляе кнігі на дом і своечасова абменьвае іх. У гэтай справе Радзьковай дапамагаюць кніганошы Тамара Барыбкіна, Таццяна Ляпшова і Таццяна Ільюшкіна. Не забывае бібліятэкар і аб тых людзях, якія жывуць у аддаленых населеных пунктах. Так, у в. Паўлаўка арганізавана перасоўная бібліятэка. Загадвае ёю ...

Хутка расце колькасць чытачоў у бібліятэцы. Цяпер іх налічваецца 617 чалавек. Асабліва часта прыходзяць абменьваць кнігі жыхары вёскі Баханы Пётр Маісейкаў, Лукаш Селязнёў, Васіль Сарокін і многія іншыя. У большасці яны праяўляюць цікавасць да мастацкай і сельскагаспадарчай літаратуры.

Вольга Дзянісаўна прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Яе часта можна бачыць на жывёлагадоўчых фермах, у брыгадах. Радзькова дапамагае жывёлаводам у афармленні чырвоных куткоў, расказвае ім аб дасягненнях перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці.

Любяць і паважаюць Воль-

ятэцы ёсць куток атэіста, стол даведак. Зроблены стэнды: «Рэвалюцыйная дзейнасць У. І. Леніна», «Цератворым у жыццё ра-

Домна Краўцова. Яна таксама прымае заказы ад наведвальнікаў на цікавыя кнігі. Рэгулярна дастаўляе іх у вёску.

гу Дзянісаўну жыхары Баханскога сельскага Савета за яе старанную працу, чуласць і ветлівасць.

**В. Мацвееў.**

**Мацвееў, В. Культурна і ветліва** / В. Мацвееў // Шлях Кастрычніка. — 1961.
*Абслугоўванне чытачоў бібліятэкарам Баханской сельскай бібліятэкі Вольгай Дзянісаўнай Радьковай.*